**В. В. Жыбуль**

*Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва*
*Мінск, Беларусь*
*buslik@tut.by*

# АСАБІСТЫ ФОНД ВЕНІЯМІНА БЛАЖЭННАГА Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ АРХІВЕ-МУЗЕІ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА: КАРОТКІ АГЛЯД

Фонд Веніяміна Блажэннага ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (ф. 460) складаюць рукапісы паэта, аўтарскія варыянты паэтычных зборнікаў, мастацкая і дзённікавая проза, лісты і фотаздымкі, малюнкі, асабістыя рэчы. У дадатку змешчаны фота аўтографаў сшытка дзённікавай і мастацкай прозы, малюнкаў паэта, друкарскай машынкі “Olympia”.

Ключавыя словы: *Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва; фонд Веніяміна Блажэннага.*

Вялікая частка творчай спадчыны Веніяміна Блажэннага захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва (РГАЛИ, ф. 3144), куды дакументы перадаў сам паэт у 1994, 1996 і 1998 гг. У Беларусі ж праца па зборы архіва В. Блажэннага была распачата ў 1999 г., неўзабаве пасля смерці творцы. Паколькі ён памёр, не пакінуўшы ніякіх пісьмовых распараджэнняў наконт сваёй маёмасці, а прамых нашчадкаў не меў, пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў была створана камісія па літаратурнай спадчыне Веніяміна Блажэннага. Паводле рашэння камісіі архіў паэта быў перададзены ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

«Я думаю, что в сложившейся ситуации это было единственно правильное решение, — пісаў у маі 2001 г. адзін з чальцоў камісіі, галоўны рэдактар часопіса “Монолог” Аляксей Андрэеў, — в суете и неразберихе первых дней после смерти Вениамина Михайловича рукописи могли просто бесследно исчезнуть из неохраняемой квартиры — кого там только не было в эти дни… Или, наряду с квартирой и нехитрыми материальными ценностями покойного поэта, они могли стать предметом торга для внезапно возникших из небытия дальних родственников» [1].

Праца па зборы архіва В. Блажэннага была завершана ў 2004 г., калі яго стрыечная сястра (па матчынай лініі) Ліна Аляксандраўна Шэршэвер, якая жыве ў Маскве, упаўнаважыла Валерыя Блуўмана перадаць асабісты архіў паэта ў БДАМЛМ. Вялікую ролю ў перадачы архіва адыграў мінскі паэт і выдавец Дзмітрый Строцаў. Усе перададзеныя дакументы сталі асновай для стварэння новага фонду №460 паэта Веніяміна Блажэннага (Веніяміна Міхайлавіча Айзенштадта). У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі дакументаў у 2013 г.

быў складзены вопіс № 1 у колькасці 202 адзінак захоўвання (1392 дакументаў) за 1900–1919 і 1940–1999 гг.

Самы аб'ёмны і важны раздзел — натуральна, рукапісы В. Блажэннага (адз. зах. 1–62) — як пісаў А. Андрэеў, "полное рукописное собрание его сочинений в 17-ти общих тетрадях и черновые записи последних стихов" [1]. Як вядома, В. Блажэнны быў схільны да цыклізацыі сваіх вершаў, і звычайна кожны сшытак змяшчае ў сабе адзін, два або тры паэтычныя цыклы, з якіх у фондзе прадстаўлены наступныя: «Ищу душу» (1940–1941), «Кровь на алтаре», «Судьбы дней», «Потери», «Земной круг» (1941–1943), «Зов души» (1941–1942), «Блужданья», «Под ветра крышей» (1943–1945), «Даль и близь», «Прежде смерти», «Цыганское» (1945–1949), «Ночной свет» (1956–1960), «Из "Книги молений"», «Прелюдия России», «Сонеты» (1959–1983), «Земной круг» (1963–1975), «Возвращение к душе» (1976–1981), «На пороге безмолвия» (1981–1983), «Единоборство», «Произвол» (1984–1987), «Обет небытия», «Сораспятье» (1987–1989»), «Осколки» [1980-я], «Жатва скорби» (1991–1994), «Все та же боль» (1994–1995), «Как долго», «Теми же устами» (1995–1997), «Боль добра» (1998), «Смертная память» (1999). Збольшага гэта арыгіналы аўтарскіх рукапісаў, аднак ёсць і некалькі ксеракопій аўтографаў са сшыткаў, перададзеных В. Блажэнным у Расійскі дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва (адз. зах. 27, 33, 37). Паколькі вопіс фонду, як і належыць, складзены паводле храналагічнага прынцыпу, даследчыкі маюць выдатную магчымасць прасачыць творчую эвалюцыю паэта цягам усяго яго жыцця, а гэта амаль 60 гадоў літаратурнай працы, прычым 40 з іх паэт пісаў "у шуфляду", нідзе не публікуючыся. Варта згадаць, што вершы запісаныя ў сшыткі акуратным, нават каліграфічным почыркам, пераважна ў храналагічным парадку. Некаторыя вершы — з ключавымі для В. Блажэннага вобразамі і матывамі — нярэдка маюць аднолькавыя назвы: перадусім «Блаженный» і «Вечный мальчик», а таксама «Смерть», «Христос», «Женщина» і інш.

Акрамя гэтага, у фондзе захаваліся аўтарскія варыянты паэтычных зборнікаў «Слух сердца» (1987, варыянты назвы — «И день, и вечер», «Голос сердца»; адз. зах. 1–7), «Жатва скорби» (1992; адз. зах. 11), «Стихотворения 1943–1997» (адз. зах. 12), раннія паэмы «Алый в бочке», «Неправый суд» (1943–1945; адз. зах. 20) і шмат разрозненых (не аб'яднаных у цэльныя вялікія цыклы) вершаў, што таксама пісаліся цягам усяго жыцця (1943–1999; адз. зах. 45–57). Апошнія ўяўляюць з сябе 13 адзінак захоўвання памерам ад 11 да 106 рукапісных і машынапісных старонак. Да адной з падборак (адз. зах. 52) прыкладзена пісьмо Аляксандра Дракахруста ад 19.02.1987 В. Блажэннаму аб выданні вершаў, а да іншай (адз. зах. 53) — пісьмо Леаніда Дранько-Майсюка ад 28.06.1990. Паэтычны машынапіс утрымлівае і рэдактарскія праўкі Л. Дранько-Майсюка.

Мы ведаем Веніяміна Блажэннага перадусім як паэта — і тым цікавей сустрэць сярод яго творчых дакументаў некалькі «непаэтычных» твораў: апавяданні «Костя» і «Светлячок» (1970-я гг.; адз. зах. 58), па-мастацку вобразныя ўспаміны пра бацькоў «Я гляжу в себя» (1978; адз. зах. 59), кароткі

машынапісны тэкст «Силуэт автобиографии» (1990-я; адз. зах. 60). Унікальным дакументам з'яўляецца адзін з агульных сшыткаў (адз. зах. 18), які прадстаўляе В. Блажэннага як шматграннага і markdown разнабаковага творцу: туды ўвайшлі не толькі вершы (у тым ліку цыклы «Потери», «Земной круг»), але і аўтабіяграфічныя апавяданні «Одушевленная ванна» (1939), «Отрывок одного вечера» (1942), «Случайная страничка эвакуации» (1942), «Проклятье» (1945), «Чужой котенок» (1945), а таксама афарызмы (у тым ліку раздзел «Юмор») і вытрымкі з дзённіка (гл. *Дадатак 1*.)

Яшчэ з аднаго боку рэпрэзентуюць асобу В. Блажэннага яго мастацкія працы: копіі партрэтаў Дж. Байрана, В. Гюго, О. Уайльда, У. Шэкспіра і інш. (папера, аловак, туш, пастэль; адз. зах. 61) і плакаты (папера, гуаш) — у тым ліку выкананыя да 50-годдзя ўтварэння СССР (адз. зах. 62). (Не будзем забывацца, што прафесійная дзейнасць Веніяміна Айзенштадта працяглы час была непасрэдна звязаная з мастацкай, афарміцельскай працай: у 1956–1965 гг. ён быў мастаком мастацкага цэху, а ў 1965–1976 гг. — шрыфтавіком-мастаком у мінскім Камбінаце надомнай працы.) (гл. *Дадатак 1*).

Даволі багата прадстаўлена ў фондзе перапіска Веніяміна Блажэннага (адз. зах. 63–90). Гэта лісты ад паэтаў Барыса Віктарава (Масква), Яўгена Еўтушэнкі (Масква), Рыталія Заслаўскага (Кіеў), Станіслава Мінакова (Харкаў), Мікалая Панчанкі (Масква), Давіда Паташнікава (ЗША), Аляксандра Радкоўскага (Масква), Дзмітрыя Танканогава (Масква) і інш., тэлеграма Грыгорыя Корына, паштоўкі Любові Турбіной, ліст літаратуразнаўца Янкі Саламевіча наконт псеўданімаў В. Айзенштадта. У ксеракопіях і машынапісных копіях захаваліся пісьмы Аляксандра Кушнера, Аляксандра Межырава, Іны Ліснянскай, Віктара Шклоўскага (адз. зах. 72). Тэксты некаторых лістоў самога В. Блажэннага захаваліся дзякуючы таму, што аўтар перапісаў іх у асобны сшытак (адз. зах. 64) або збярог чарнавікі (адз. зах. 65). Перапісваўся паэт не толькі з калегамі па пяры. Перыядычна ён атрымліваў лісты ад бібліяфілаў па пытаннях кнігаабмену (адз. зах. 80), а ў апошнія гады жыцця — і ад чытачоў, прыхільнікаў творчасці (адз. зах. 81). Асобную архіўную справу склалі канверты з адрасамі карэспандэнтаў В. Блажэннага — агулам 80 штук (адз. зах. 88).

Даследчыкам біяграфіі паэта, безумоўна, цікава пазнаёміцца з дакументамі, якія адлюстроўваюць раннія (але, на жаль, беспаспяховыя) спробы В. Блажэннага далучыцца да літаратурнага жыцця. З такіх дакументаў ёсць «Пісьмо П. С. Пестрака (літкансультанта па прозе СПП БССР) з водгукам на апавяданні В. Блажэннага» (1950; адз. зах. 103) і «Пісьмо У. Д. Цыбіна (літкансультанта СП СССР) з водгукам на вершы В. Блажэннага» [1950-я гг.] (адз. зах. 104), «Пісьмо рэдакцыі часопіса "Звезда" В. Блажэннаму па пытаннях публікацыі вершаў» (1956; адз. зах. 83).

Прывядзем прыклады крытычных ацэнак творчасці яшчэ маладога Веніяміна Айзенштадта. У прыватнасці, Уладзімір Цыбін пісаў пра яго паэзію: *«Дорогой тов. Айзенштадт! Когда читаешь Ваши стихи, чувствуешь, что они*

*написаны умело, даже зрело и вместе с тем, торопливо, неряшливо.* […] *Вы сейчас — в поисках своих путей, своего стиля, своих тем. Но надо не только искать, но и закреплять достигнутое, закреплять полноценными поэтическими произведениями…* […] *Вам очень вредит композиционная разбросанность, если так можно сказать. В ваших стихах зачастую нет крепкого каркаса — поэтической магистральной мысли, которая могла бы увязать отдельные детали в одно целое»* (адз. зах. 104, арк. 1.).

Параўнальна неблагую, але ўсё ж не спрыяльную публікацыям ацэнку атрымала проза В. Блажэннага: *«Уважаемый товарищ Айзенштадт! Вы, видимо, имеете уже за собой практику писательства. У вас выработался свой вкус. Владеете неплохо словом, точностью рисунка, психологическим анализом. Все это хорошая сторона дела.*

*Слабость Ваша заключается в том, что зачастую бедно содержание ваших рассказов и неудачные окончания».* Далей ідзе кароткі разбор апавяданняў «Жена», «Ребенок», «Передовая позиция», «Зрячесть», «Старый актер». *«У вас есть данные на неплохого новеллиста. Стоит и дальше пробовать своих сил»* (адз. зах. 103, арк. 1), — рэзюмуе літкансультант, пісьменнік Піліп Пестрак.

Прадстаўнік рэдкалегіі ленінградскага часопіса «Звезда», паэт Георгій Някрасаў абмежаваўся лаканічным заключэннем: *«Ваши сонеты, к сожалению, напечатать не можем. У нас очень велик запас стихов. Если бы Ваши стихи были наполнены впечатлениями и наблюдениями, непосредственно связаны с современностью — было бы легче решать вопрос о печатании их»* (адз. зах. 83, арк. 1).

І нават ужо ў гады запозненага прызнання, выступаючы ў друку і рыхтуючы да выдання кнігі вершаў, В. Блажэнны сутыкаўся з вельмі неадназначным стаўленнем да сваёй творчасці з боку пісьменніцкай і выдавецкай супольнасці. Няпростая гісторыя выдання яго першай кнігі адлюстравалася не толькі ў машынапісных варыянтах зборніка з аўтарскімі і рэдактарскімі праўкамі (адз. зах. 1–7), але і ў такіх, напрыклад, дакументах, як «Рэцэнзіі С. З. Гаўрусёва, Н. З. Кісліка, заключэнне Х. З. Жычкі на рукапіс зборніка вершаў В. Блажэннага “И день, и вечер”» (адз. зах. 101) і «Пісьмо В. Блажэннага загадчыку аддзела паэзіі выдавецтва “Мастацкая літаратура” В. Б. Спрынчану з водгукам на рэцэнзію С. З. Гаўрусёва на рукапісны зборнік “И день, и вечер”» (адз. зах. 66), датаваныя ўжо 1987-м годам. З названых тэкстаў рэцэнзія Сцяпана Гаўрусёва мае рэзка адмоўны, месцамі нават абразлівы характар (складваецца ўражанне, што яе аўтар не прымаў эстэтыку В. Блажэннага ўвогуле і праз гэта адмаўляў яму ў існаванні ў літаратурным свеце). Кантраснай выглядае рэцэнзія Навума Кісліка, які знайшоў у рукапісе «выразительные образы истинно поэтического зрения, чувства, мышления» і зрабіў выснову, што «перед нами человек высоко одаренный», «да и знающий дело, умелый», і што рукапіс абавязкова павінен стаць кнігай (адз. зах. 101, арк. 4 адв.). Хведар Жычка ў заключэнні прымірэнча адзначыў, што «нягледзячы на… недахопы, зборнік заслугоўвае

ўвагі, ёсць сэнс працаваць з аўтарам» (адз. зах. 101, арк. 5). Нагадаем, што кнігай рукапіс стаў праз тры гады — пад назваю «Слух сердца», і для паэта, які бесперапынна займаўся творчасцю цягам паўстагоддзя, гэта быў першы зборнік.

Не можа не ўразіць вялікі раздзел «Дакументы, сабраныя В. Блажэнным» (адз. зах. 106–168) — па колькасці дакументаў ён роўны раздзелу «Рукапісы В. Блажэннага». Раздзел сведчыць пра шырокае кола літаратурных зацікаўленасцяў паэта: большую частку склалі творы вядомых майстроў паэзіі, перапісаныя ад рукі В. Блажэнным у сшыткі і блакноты або надрукаваныя на машынцы. Гэта зборнікі рускіх паэтаў Срэбнага веку Мікалая Гумілёва, Мікалая Клюева і Восіпа Мандэльштама, а таксама машынапісы літаратурных сучаснікаў В. Блажэннага: «Нерв» Уладзіміра Высоцкага, «Тишина. 1977–1982» Іны Захаравай, «Потеря потери» Зінаіды Міркінай і вялізная колькасць асобных вершаў і паэм розных аўтараў — зноў жа, пераважна расійскіх (Б. Ахмадуліна, Г. Ахматава, І. Бродскі, М. Забалоцкі, В. Зюськін, У. Набокаў, Б. Пастэрнак, Г. Сапгір, І. Севяранін і інш.), але ёсць і замежныя (Дантэ Аліг’еры, У. Блэйк, В. Гюго, М. Канапніцкая, Дж. Кітс, П. Неруда, У. Шэкспір), і народаў былога СССР (І. Грышашвілі, Л. Койдула, Г. Леанідзэ, І. Мосашвілі, М. Рыльскі, Т. Табідзэ, П. Тычына і інш.). Беларуская паэзія прадстаўлена творамі Янкі Купалы (адз. зах. 115).

Найбольшую ж цікаўнасць і пашану, калі меркаваць па дакументах гэтага раздзела вопісу, Веніямін Блажэнны меў да асобы і творчасці Марыны Цвятаевай. У фондзе захоўваюцца не толькі аддрукаваныя на машынцы зборнікі вершаў паэтэсы (адз. зах. 140–142), але нават нарысы (адз. зах. 144) і частка эпісталярнай спадчыны (адз. зах. 145), перапісаныя ад рукі В. Блажэнным, і іншыя дакументы. Ёсць таксама ўспаміны жыхароў г. Елабуга пра апошнія дні жыцця і смерць М. Цвятаевай (адз. зах. 146), фотаздымкі паэтэсы з членамі яе сям’і (адз. зах. 186), яе дамоў і магільнага крыжа (адз. зах. 184).

Акрамя таго, В. Блажэнны выпісваў у сшыткі асобныя выказванні і цытаты з твораў сусветнай класікі (сярод прадстаўленых імёнаў — Дж. Байран, А. Барбюс, Г. Гейнэ, В. Гюго, Ф. Дастаеўскі, Т. Ман, Э. По, Р. Ралан, Р. Тагор, Л. Талстой, У. Шэкспір і іншыя). У фондзе паэта такія сшыткі займаюць 7 адзінак захоўвання (адз. зах. 162–168), агулам — 789 старонак.

Даследчыкам жыццяпісу паэта будзе цікавы раздзел «Дакументы да біяграфіі В. Блажэннага» (адз. зах. 91–99). Тут сабраныя пенсіённыя пасведчанні, пасведчанні інваліда (ксеракопія), прафсаюзны білет, даведкі аб заробку, ганарарныя ведамасці, працоўная кніжка за 1943–1976 гг., спіс кніг з бібліятэкі В. Блажэннага, складзены для абмену (1981), запісныя кніжкі, запіскі з тэлефонамі і адрасамі розных асоб, членскія білеты Саюза пісьменнікаў і Літаратурнага фонду і г.д. Здавалася б, дакументы вельмі празаічныя, датычныя звычайных побытавых рэчаў, аднак і гэты раздзел вопісу засведчыў, што Веніямін Блажэнны літаральна жыў паэзіяй. Адна з архіўных спраў мае назву: «Алфавітны паказальнік вершаў, дасланых В. Блажэнным Я. М. Вінакураву,

Р. А. Корыну, А. С. Кушнеру, А. А. Таркоўскаму, А. Р. Чухонцаву і інш.» [1980-я гг.] (адз. зах. 96). Гэтая справа нібы ўзаемадапаўняе раздзел «Перапіска», у якім лістоў самога В. Блажэннага захавалася няшмат (у адрозненне ад лістоў да яго). Тут жа мы бачым, наколькі актыўна паэт дзяліўся з вядомымі адрасатамі сваімі вершамі: алфавітны паказальнік складае агулам 152 аркушы сшыткаў і разрозненых старонак!

У раздзеле «Выяўленчыя дакументы» (адз. зах. 169–190) захоўваецца нямала фотаздымкаў В. Блажэннага. Самы ранні з іх датуецца прыкладна 1927-м годам, дзе будучы паэт сфатаграфаваны ў групе з аднакласнікамі 24-й сямігадовай працоўнай школы г. Віцебска (адз. зах. 176). Большасць фотаздымкаў паэта 1935–1990-х гг. — індывідуальныя, частка — разам з жонкай Клаўдзіяй Цімафееўнай Чумаковай (у тым ліку ў час адпачынку ў санаторыях Грузіі, Расіі), іншыя — у групах з сябрамі і знаёмымі. Асобна згадаем фатаграфіі ў групах з паэтамі Грыгорыем Корыным, Аляксандрам Радкоўскім, Дзмітрыем Танканогавым, Давідам Паташнікавым, празаікам-дакументалістам Святланай Алексіевіч, спевакамі Аленай Камбуравай і Юрыем Шаўчуком. Ёсць і ценявы партрэт В. Блажэннага, намаляваны невядомым мастаком у 1968 г.

Асобны раздзел склалі дакументы блізкіх сваякоў паэта (адз. зах. 191–202). Гэта асабовы лісток па ўліку кадраў бацькі — Міхаіла Восіпавіча (Міхла Ашэравіча) Айзенштадта (1951), пасведчанне аб смерці маці — Любові Саламонаўны (Любы Шлеймаўны) Айзенштадт (1958) і шэраг дакументаў жонкі — Клаўдзіі Цімафееўны Чумаковай. Сярод апошніх — блакнот з дзённікавым запісам пра мужа (1970-я гг.), лісты ад родных і знаёмых (1950–1995), пратаколы прафсаюзных сходаў, пісьмы, заявы К. Ц. Чумаковай у розныя ўстановы пра стан працы машынапіснага бюро фірмы «Радуга» (1954–1988), лісты К. Ц. Чумаковай у розныя ўстановы па бытавых пытаннях (1957–1998) і інш.

З асабістай бібліятэкі Веніяміна Блажэннага ў БДАМЛМ паступілі 9 кніг, выдадзеных у розны час у Маскве: «Печальный детектив» В. Астаф'ева (1986; 2 экз.), «Стихотворения 1966–1980 гг.» І. Ліснянскай, «Избранное» Д. Пятроўскага (выданні 1956 і 1957 гг.) і яго ж «Черноморская тетрадь» (1928), «Избранное» А. Таркоўскага (1982), «Орфографический словарь» Д. Ушакова (1938), «Мастера разных эпох» А. Эфраса (1979), а таксама два нумары часопіса Беларускага таварыства інвалідаў «Акно» (1996, №2; 1997, №4). Папоўніліся фонды БДАМЛМ і ўсімі выдадзенымі на той момант кнігамі В. Блажэннага (Айзенштадта). Выдавец Ігар Віркоўскі перадаў у дар архіву-музею зборнікі «Возвращение к душе» (Москва, 1990), «Слух сердца» (Минск, 1990), «Сораспятье» (Минск, 1995), «Скитальцы духа» (Минск, 2000), паэт і выдавец Дзмітрый Строцаў — кнігі «Моими очами: стихи последних лет» (Москва, 2005), «Сораспятье» (Москва, 2009) і «Верлибры» (Минск, 2011). Таксама ў БДАМЛМ патрапілі калектыўныя зборнікі «Добрыми глазами» (Минск, 1983), «Одинокий поэт» (Минск, 1997) і аб'ёмная анталогія «Осво-

божденный Улисс: Современная русская поэзия за пределами России» (Москва, 2004), у якія ўвайшлі і вершы В. Блажэннага.

Акрамя дакументаў і кніг, на захаванне ў якасці музейных прадметаў у БДАМЛМ паступілі дзве рэчы, якія належалі Веніяміну Блажэннаму (інв. № 597, 598): нямецкая друкарская машынка «Olympia» (як пазначана ў вопісе, *«чорнага колеру з чорнымі клавішамі, стан здавальняючы»*), і чамадан з фанеры, абцягнуты чорным дэрмантынам, вытворчасці аршанскага завода «Красный борец» (*«стан кепскі»*) (гл. *Дадатак 1*).

Асабісты фонд Веніяміна Блажэннага (Айзенштадта) адкрыты для даследчыкаў, і няма сумневу, што ў ім знойдзецца багата карысных матэрыялаў для новых выданняў творчай спадчыны паэта, напісання літаратуразнаўчых артыкулаў, біяграфічных нарысаў. Увогуле, фонды В. Блажэннага ў маскоўскім РГАЛИ і мінскім БДАМЛМ узаемадапаўняюць адзін аднаго: хоць частка дакументаў і дублюецца (паэт часта рабіў рукапісныя копіі сваіх твораў), аднак многія з'яўляюцца ўнікальнымі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Андреев А. «Беспризорные вещи, что помнят живых...»: Посмертная судьба наследия Вениамина Блаженного // Индекс/Досье на цензуру: журнал. URL: http://index.org.ru/journal/14/andreev1401.html

2. Блажэнны Веніямін (Айзенштадт Веніямін Міхайлавіч). Паэт. 15.10.1921–31.07.1999. Фонд № 460. Вопіс № 1. 1900–1919, 1940–1999 гг. Мінск: Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва", 2013. 21 л.